УДК 811.161.3'373.43

# ПРЫЧЫНЫ ЎЗНІКНЕННЯ АКАЗІЯНАЛІЗМАЎ

***А. У. Канапелька*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Паэты і пісьменнікі ў пошуках выразных сродкаў мастацкага маўлення часам звяртаюцца да словатворчасці. Мастацкі падыход да асэнсавання рэчаіснасці стварае неабмежаваныя магчымасці для наватарства. Аўтарскай задуме падпарадкоўваюцца не толькі нарматыўныя факты мовы, але і адхіленні ад літаратурных норм – так званыя аказіяналізмы. Узнікненне аказіяналізмаў у значнай ступені абумоўлена няспыннымі пісьменніцкімі пошукамі незвычайных паводле структуры і зместу слоў, здольных больш дакладна, вобразна, з улікам уласных уяўленняў аўтара і канкрэтнай маўленчай сітуацыі перадаць ідэю твора, здзівіць чытачоў сваёй навізной і экспрэсіўнасцю.

Г.І. Басава [1], М.Р. Прыгодзіч [2] лічаць, што прычыны, якія падштурхоўваюць мастакоў слова да стварэння індывідуальна-аўтарскіх утварэнняў, наступныя: а) неабходнасць дакладна выказаць думку (узуальных слоў для гэтага можа быць недастаткова); б) імкненне аўтара каратка выказаць думку (наватвор можа замяніць словазлучэнне і нават сказ); в) патрэба падкрэсліць свае адносіны да прадмета гаворкі, даць яму сваю характарыстыку, ацэнку; г) імкненне своеасаблівым аблічам слова звярнуць увагу на яго семантыку, дэаўтаматызаваць ўспрыманне; д) патрэба пазбегнуць таўталогіі; е) неабходнасць захаваць рытм верша, забяспечыць рыфму, дасягнуць патрэбнай інструментоўкі. Першыя тры прычыны з'яўляюцца асноўнымі. Вельмі часта ўзнікненне наватвора бывае выклікана не адной, а адразу некалькімі прычынамі. Выкары-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

станне моўных сродкаў у мастацкай літаратуры ў выніку падпарадкавана аўтарскай задуме, зместу твора, стварэнню вобраза і ўздзеянню праз яго на адрасата.

Аказіянальныя словы сведчаць шырокія семантыка-стылістычныя магчымасці роднага слова, значна ўзбагачаюць выяўленчую аснову твора, дазваляюць максімальна акрэслена перадаць аўтарскае светаадчуванне.

**Літаратура**

1. **Басава, Г. І.** Аказіяналізмы / Г. І. Басава // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва : у 5 т. / пад рэд. І. П. Шамякіна. – Мінск., 1984–1987. – Т. 1. – С. 65.

2. **Прыгодзіч, М. Р.** Аказіяналізмы як крыніца папаўнення лексічнага саставу сучаснай беларускай мовы / М. Р. Прыгодзіч // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2009. – № 2. – С. 34–36.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова